І В А Н   Ч Ы Г Р Ы Н А Ў

# ПРЫМАК

П’ЕСА Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ



ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

# ПРЫМАК

П’ЕСА Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ

# ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

- **Ягайла –** *кароль*
- **Соф'я Гальшанская –** *ці не чацвёртая жонка Ягайлы, якую пры польскім двары завуць Сонькай*
- **Кракаўскі Біскуп.**
- **Кракаўскі ваявода**
- **Ахоўнік** *і нейкая давераная асоба пры каралі*
- **Чалавек без імя**
- **Юльян –** *стары рыцар з Вялікага Княства*
- **Вітаўт –** *вялікі князь*
- **Сігізмунд –** *імператар свяшчэннай Рымскай імперыі, кароль венграў*
- **Іван Друцкі –** *князь, здаецца, стрыечны брат каралевы Соф'і*
- **Юродзівы**
- **Дзве шляхцянкі**
- **Рыцары, слугі**

# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

## К А Р Ц І Н А I

*Здаецца, 1429 год. Лясныя ўгоддзі пад Кракавам. Кароль Рэчы Паспалітай Ягайла з часткай двара на паляванні. Уласна, гэта толькі так – на паляванні, бо паляванне тое даўно скончана: тушы казуль і быкоў асвежаваны і з'едзены вялікай світай. Ягайла сядзіць адзін у паляўнічым каралеўскім доме. Заходзіць кракаўскі Біскуп.*

**Біскуп.** Будзь слаўны Езас Хрыстас наш!

**Ягайла.** Ва векі вякоў!

**Біскуп.** Амін!

**Ягайла.** Добра, што не забываеш пра мяне, грэшнага, Біскуп.

**Біскуп.** Такі ў мяне лёс – быць паміж госпадам богам і яго намеснікам на зямлі, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Дзякуй, дзякуй, Біскуп. Чым заклапочаны?

**Біскуп.** Я малюся за Польшчу, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Так, так – за Польшчу, біскуп, за Рэч Паспалітую.

**Біскуп.** І за караля, мой вялікі і славуты гаспадар.

**Ягайла.** Так, так, біскуп – і вялікі, і славуты. А што робіцца ў нашай неабсяжнай краіне?

**Біскуп.** Варшава танцуе, мой кароль, у Львове кахаюцца, Вільня рыхтуецца да каранацыі, Кіеў у карты гуляе, а Кракаў моліцца, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла** *(уздыхае)*. А мы, біскуп, бачыш – на паляванні.

**Біскуп.** Так, бачу, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Але не замінаеш Кракаву маліцца. Дык чаму хмурышся, біскуп?

**Біскуп.** Ваявода кракаўскі скардзіўся перад маім ад'ездам сюды, што Вітаўтавы рыцары зноў пачалі нападаць на польскія маёнткі.

**Ягайла.** Дык яны і не пераставалі рабіць гэтага, дарма што заўсёды хораша дамаўляліся.

**Біскуп.** А ўсё таму, ваша каралеўская вялікасць, што вы літвінам багата патураеце.

**Ягайла.** Не, Біскуп. Гэта не так. Прычына ў тым, што Вітаўт магутны князь. І ў яго адважныя воі. Ну, можа, і таму, што ён мой брат.

**Біскуп.** Але ж кароль знаходзіў управу на іншых. Напрыклад, на Скіргайлу. Таксама ж брат.

**Ягайла.** Скіргайла ўсяго толькі князь. А Вітаўт – вялікі князь. Пра гэта не трэба забываць. Пры дапамозе Вітаўта мы атрымалі выхад да Чорнага мора. Пры Вітаўту пасля вайны з Масквой наша дзяржава замацавала свае граніцы на ўсходзе на рэках Угра і Ака. Гэта табе, біскуп Збігнеў, не зубрыныя яйцы. Ды і пры Грунвальдзе...

**Біскуп.** Гэта так, ваша каралеўская вялікасць. Герой. Але Вітаўт да ўсяго яшчэ хоча быць каралём.

**Ягайла.** У адной дзяржаве два каралі?

**Біскуп.** Выходзіць, так.

**Ягайла.** Ці адгаворвалі зноў яго?

**Біскуп.** Не памагае. У Вільню вярнуліся з Венгрыі паслы ад Сігізмунда, імператара свяшчэннай Рымскай імперыі.

**Ягайла.** Ну і што?

**Біскуп.** Імператар і гэты раз абяцаў Вітаўту карону.

**Ягайла** *(доўга маўчыць, тады гаворыць).* Значыць, Сігізмунд кагосьці рыхтуе на польскую карону, раз падтрымлівае Вітаўта. А можа, і нам не перашкаджаць Вітаўту? Няхай паносіць кавалак металу на галаве?

**Біскуп.** Але ж дзве каранаваныя асобы ў адной дзяржаве?..

**Ягайла.** У гісторыі і не такое здаралася. Што ж, біскуп, значыць, нічога новага. Я і сам калі быў вялікім князем, марыў надзець на сваю галаву карону. Але тады не было спрыяльнага Сігізмунда. Ды і палякі неўзабаве прапанавалі мне стаць каралём: аддалі ў жонкі Ядвігу.

**Біскуп.** І вось ужо блізка пяцьдзесят гадоў, як у дзяржаве адзін кароль. А не два.

**Ягайла.** Адзін, а не два. А то было б. Гэта ўсё роўна, як два мядзведзі ў адной бярлозе. А калі Вітаўт хоча каранавацца?

**Біскуп.** Карона – рэч далікатная. Яе яшчэ трэба прывезці ў княства. Да таго ж кажуць, што Вітаўт збірае ў Луцк усю ўплывовую Еўропу.

**Ягайла.** Дзяржавы збіраюцца, і дзяржавы разбягаюцца.

**Біскуп.** Я вас не зусім разумею, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Што тут не разумець, біскуп? Дзяржавы, як і людзі – спярша знаходзяцца ў маладым узросце, пасля сталеюць, затым старэюць. А ў выніку, як і чалавечае цела, – распадаюцца.

**Біскуп.** Крый нас божа ад гэтага. Яшчэ Польшча моцна. Ды пры такім каралі...

**Ягайла.** Не дагаджай мне, біскуп Збігнеў. Усё ў руках усявышняга. Але каралі таксама старэюць і паміраюць.

**Біскуп.** Ці ж вам наракаць на лёс? Хіба не ў каралевы, вашай улюбёнай жонкі, амаль штогод па дзіцяці нараджаецца. Вось і Казік з'явіўся.

**Ягайла.** Так, Казімір працягне наш каралеўскі род. Пасля Казіміра Трэцяга будзе Казімір Чацвёрты. Шкада, што з Ядвігай не было ў нас наследніка. А гэтыя яшчэ невядома ад каго...

**Біскуп.** Бог ведае... Дык якая будзе ваша воля гэты раз пра каранацыю Вітаўта?

**Ягайла.** Пакуль ніякай. Сам жа кажаш, што карона – далікатная рэч і давезці яе нялёгка. Ну і ў Луцку варта пабываць. І самому паказацца і на другіх манархаў падзівіцца. Дарэчы, а нам запрасінаў яшчэ не было?

**Біскуп.** Не, мой кароль.

**Ягайла.** Вітаўт не забудзе нас, Дык на што там ваявода кракаўскі скардзіцца?

**Біскуп.** Літоўскія грабежнікі нападаюць на маёнткі нашых магнатаў.

**Ягайла.** Дык у чым справа? Няхай польскія рыцары добра абараняюцца! *(Сядзіць, доўга думае, тады зноў гаворыць).* Але ж трэба неяк скончыць гэтыя звады. Пакліч, біскуп, мне кракаўскага ваяводу. А то з гэтых маленькіх набегаў можа атрымацца нешта вялікае. Незарма ж Вітаўт памкнуў да ўласнай кароны.

**Біскуп.** З намі бог, ваша каралеўская літасць. *(Крыжуе Ягайлу).*

**Ягайла.** Я накіраваў тут, у Вавель да каралевы, ганца. Абяцаў заўтра быць у Кракаве. Але ці зрабіла каралева ў касцёле тое, што ёй належала? Ці выканала яна рашэнне каралеўскага суда? Без гэтага мне дарогі ў Вавель няма. Сюды вось, у паляўнічы дом, перанясу ўсё патрэбнае для кіраўніцтва дзяржавай. Дык што, біскуп?

**Біскуп.** Вінават, ваша каралеўская вялікасць. Мне б з гэтага пачаць. Але ж не здагадваўся, што... Словам, кругом вінаваты.

**Ягайла.** Ну дык што там?

**Біскуп.** Усё зроблена, ваша вялікасць. Каралева дала клятву ў касцёле ў прысутнасці вельмі высокапастаўленых дам, што чыста перад каралём.

**Ягайла.** Значыць, дарэмна мы непакоіліся, што ў каралеўстве нікога не знойдзецца, каб прыкрыць наш сорам?

**Біскуп.** Наадварот. Дамы маліліся разам з каралевай так, быццам сваю віну замольвалі перад госпадам богам.

**Ягайла.** Гэта добра. Калі ўжо рашылі даравацьь каралеве яе распуства, то на што не пойдзеш?! Але навошта ёй было ажно сем жарабкоў дзеля гэтага? Канешне, яна кабета здаровая і маладая. Але ж тым не менш наладжваць пры жывым мужыку вяртэп?

**Біскуп.** Ат, не майго гэта розуму справа, ваша каралеўская літасць.

**Ягайла.** Каму-каму, а каралю-мужу ганьба. Выходзіць, і дзеці – не мае? Але ад дзяцей я не адмоўлюся. Польшчы патрэбна дынастыя. І не быў бы я каралём, каб не паклапаціўся пра яе. Няхай я тут, у вас, прымак, але ж дзеці мае... Спадзяюся, што яны паслужаць.

**Біскуп.** Ніхто цябе ў каралеўстве прымаком не лічыць.

**Ягайла.** Але ж і ў каралеўстве шэпчуцца?.. Не кажучы пра княства.

**Біскуп.** Гіцаль брэша – вецер носіць.

**Ягайла.** Вось-вось! Дык кажаш, біскуп, каралева ачысцілася ў касцёле?

**Біскуп.** Так.

**Ягайла.** Ну а тыя рыцары?.. Што скурвіліся? Дзе яны?

**Біскуп.** Пахаваліся ад каралеўскага гневу. Уцяклі за межы каралеўства.

**Ягайла.** Спадзяюся, не да Вітаўта?

**Біскуп.** Не, добры кароль. Хто ў Саксонію, хто к немцам у іхнія замкі.

**Ягайла.** Значыць, віну сваю чуюць?

*Біскуп маўчыць, не адказвае. Але каралю ўсё яшчэ рупіць нядаўні скандал у каралеўскім Вавелі, звязаны са здрадай жонкі, Соф'і Гальшанекай. Стары кароль імкнецца ўладзіць справу.*

Значыць так, біскуп, мае дзеці – гэта каралеўскія дзеці. Ім наследаваць стол мой. Ну а... Цяпер пра Соньку, каралеву. У дзяцей павінна быць жывая маці. Без гэтага ўсё будзе выглядаць акурат дрэнна. Так што, няхай палякі прыкусяць языкі. Я не дазволю крыўдзіць маці маіх дзяцей. Ну а што тычыцца блудлівых рыцараў, то яны мусяць адказаць за сваю похаць. Бачыце, дзевак ім у Полышчы мала!

**Біскуп.** Судзіць будзем прынародна?

**Ягайла.** Навошта?

**Біскуп.** Каб таксама пакаяліся за напрасліну.

**Ягайла.** Не, Біскуп. Кожнага ў мяшок ды рыбкам на дно вазёрнае. Ну а што Соньчыны камерысткі? Што з імі? Нябось, дапамагалі каралеве ў яе блудзе?

**Біскуп.** З імі разбіраўся князь Вітаўт.

**Ягайла.** Чаму так?

**Біскуп.** Сама каралева захацела. Дзеля аб'ектыўнасці.

**Ягайла.** А можа, каб прыкрыць яшчэ нейкі сорам?

**Біскуп.** Пра гэта адзін усявышні ведае. Але ў сведкі яго не пазавеш.

**Ягайла.** Не пазавеш, біскуп, не пазавеш!.. І чым жа ўсё скончылася ў Вітаўта з камерыеткамі?

**Біскуп.** Загадаў задраць спадніцы ды высекчы.

**Ягайла.** Фу! Усё-ткі брат мой Вітаўт варвар. Гэта ж так абысціся з жанчынамі! Фу!

**Біскуп.** Кабета – заўсёды сасуд грэшны.

**Ягайла.** Але ж грахі трэба калі-нікалі ўмець і даравацъ!

**Біскуп.** Каралю ўсё можна, мой вялікі літасцівец.

**Ягайла.** Але ты чымсьці незадаволены, біскуп?

**Біскуп.** Па гразі ходзім.

**Ягайла.** Выходзіць, я сёння тваё месца заняў? Табе ж належыць грахі адпускаць.

**Біскуп.** Грахі грахам розніца. Дзяржаўныя грахі адпускаць толькі ва ўладзе кесара. А што датычыць мяне, то... Я здольны адно маліцца за грэшнікаў.

**Ягайла.** Добра, біскуп, ідзі маліся. А я тут таксама сваёй Брыгіце памалюся. Ды не забудзь накіраваць да мяне ваяводу кракаўскага. Мы з ім таксама прыкінем пра каранацыю, што там да чаго.

**Біскуп.** Ен яшчэ недзе тут. Калі, вядома, не паспеў ад'ехаць...

**Ягайла.** Няхай пашлюць наўздагон вершніка. Дарэчы, біскуп, як табе спіцца па начах?

**Біскуп.** Як хлопу пасля добрай ярмаркі.

**Ягайла.** А мне і гэтага не дадзена. Гарэлкі не п'ю, кабет не.. Цьфу, цьфу! Во не сказаў бы, што на дварэ сцямнела. *(Смяецца)*.

**Біскуп.** З намі бог, ваша каралеўская вялікасць. *(Крыжуе ру кой Ягайлу. Затым выходзць)*.

## КАРЦІНА ІІ

*Ягайла зноў адзін. Пляскае ў далоні. Заходзіць каралеўскі ахоўнік – увесь у чорным, як манах.*

**Ахоўнік.** Слухаю, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Чуеш тупат?

**Ахоўнік.** Не. Тут ціха.

**Ягайла.** Гэта мая старая конніца. Кудысьці зноў скіравалася. А можа, гэта тупат яшчэ ад старых паходаў? Але мне трэба сюды аднаго рыцара, каб разабрацца. Ведаеш каго?

**Ахоўнік.** Не, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла** *(доўга думае)*. Ну, таго... *(І, здаецца, зусім пра іншае)*. Ты са мной на Сіняй вадзе быў?

**Ахоўнік.** О, ваша каралеўская вялікасць! Мне ўсяго трыццаць. А бітва на Сіняй вадзе, кажуць, адбывалася больш як пяцьдзесят гадоў назад.

**Ягайла.** Ну так. Я ўспамінаю. Больш як за пяцьдзесят. Ты ведаеш, я цяпер... З цяжкасцю часам даходжу ў сваёй галаве да некаторых рэчаў. Тое, што было ў дзяцінстве, помню... А так... І вось бітву на Сіняй вадзе добра запомніў, бо быў малы. І бацька мой, вялікі князь Альгерд, браў мяне туды з сабой. І я ўсё бачыў. А вось пра другую бітву... Не, на самую бітву я, здаецца, не трапіў... Ужо слаба помню. Думаеш, гэта старасць?

**Ахоўнік.** Не ведаю, я пры вас, ваша каралеўская вялікасць, увесь свой дужы ўзрост.

**Ягайла.** Дужы ўзрост... Што гэта значыць, дужы ўзрост?

**Ахоўнік.** А тое, ваша каралеўская вялікасць, што ўсё свядомае жыццё стаю пры ўваходзе да вас то з аднаго боку дзвярэй, то з другога.

**Ягайла.** Цяжка стаяць?

**Ахоўнік.** Мне гэта за вялікі гонар.

**Ягайла.** А мне вось увесь час тут у прымаках быць вельмі цяжка. Думаў, пасля Ядвігі гэтае адчуванне мінецца. На тое і Соньку ўзяў з Галынанскага роду. Але ж не. Справа не ў польцы Ядвізе і справа не ў літвінцы Соньцы. Справа – у паляках. Проста, яны пакваціліся на Вялікае Княства. І я здрадзіў свайму народу. Здрадзіў брату Вітаўту, хоць вельмі любіў яго. І цяпер люблю. Аднак каму скажаш? Жывуць два народы побач, а як сабакі паміж сабой.

**Ахоўнік.** Ваша праўда.

**Ягайла.** А то ж... А можа, хочаш на волю, напрыклад, трусоў разводзіць. Тут непадалёку ёсць вялікае поле, маё поле, то аддам за службу. Будзеш разводзіць трусоў.

**Ахоўнік.** Не, ваша каралеўская вялікасць. Мне каля вас стаяць за гонар!..

**Ягайла.** Глядзі, хлопча, глядзі. А то будзеш разводзіць трусоў. Я гэта толькі што ўспомніў. Так, і гэта было даўно. Я і не скажу калі. Але то было ў вялікае навадненне. Сігізмунд мне абяцаў тады даць многа трусоў, на развод. Ён

гаварыў, што гэтыя істоты вельмі хутка дадуць прыплод. Такім чынам людзі пазбегнуць голаду. Дык як?

**Ахоўнік.** Але сёлета, ваша каралеўская вялікасць, год на ўрачжай багаты. Навошта разводзіць трусоў? Голаду не будзе.

**Ягайла.** Калі голаду не будзе, то і трусоў разводзіць няварта. А вось скажы, чаму каралева такая пладавітая? Амаль штогод па дзіцяці? Таму я і ўспомніў пра трусоў, якіх мне абяцаў Сігізмунд. Мне хацеў даць трусоў для разводу, а Вітаўту абяцае карону. Але навошта нам дзве кароны ў адной дзяржаве? Ты не ведаеш?

**Ахоўнік.** Так, ваша каралеўская вялікасць, не ведаю.

**Ягайла.** Ну, то ідзі скажы каму-небудзь з рыцараў, каб імчаў да каралевы. Няхай скажа, што кароль сапраўды заначуе тут. У караля пасля свежыны жывот сапсуўся. Вось! *(Ляпае даланёй сабе па жываце)*. Але і таго, другога, таксама пашлі сюды. Ну, таго, што...

**Ахоўнік.** Слухаю, ваша каралеўская вялікасць.

*Ахоўнік выходзіць. Колькі часу Ягайла ў пакоі застаецца адзін. Нарэшце заходзіць Чалавек без імя.*

**Ягайла** *(да зайшоўшага)*. Як цябе завуць, рыцар?

**Чалавек без імя.** Я не рыцар, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Але адказваеш, як рыцар. Зрэшты, няхай сабе. Вакол караля заўсёды тоўпяцца найбольш людзі, якія завуць сябе рыцарамі. Простаму люду сюды няма ходу. Дык як цябе завуць?

**Чалавек без імя.** Я, ваша каралеўская вялікасць, без імені.

**Ягайла.** Што так?

**Чалавек без імя.** А яно мне непатрэбна ў маім жыцці. Дастаткова гукнуць – Гэй, ты! Але людзі часам завуць мяне, быццам у насмешку, тутэйшым ваяводам.

**Ягайла** *(смяецца)*. Чаму так? Можа, служыў пры двары ваяводы Станіслава?

**Чалавек без імя.** І не служыў, і нават не бачыў ваяводу.

**Ягайла.** І тым не менш – нечым падобны. *(Зноў смяецца)*. Пан Станіслаў ніколі не спыняўся на спастой у вашым двары?

**Чалавек без імя.** У нас двара не было. Ды і бацькоў сваіх я не ведаю, хто яны.

**Ягайла.** Хіба што. Значыць, ты проста – Гэй, ты!?

**Чалавек без імя.** Так, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Гэта яшчэ лепей. Я хачу сёе-тое табе прапанаваць. Я дам табе тысячу злотых за адно тое, што ты згодзішся выслухаць мяне. Калі ж ты рашыш, што мая прапанова табе не падыходзіць, ты возьмеш гэтыя тысячу злотых, пойдзеш адсюль і ніколі нікому не станеш расказваць пра нашу размову. Разумееш?

**Чалавек без імя.** Вы хочаце, каб я парушыў закон?

**Ягайла.** Так. Але каралеўскі закон і для караля. Разумееш?

**Чалавек без імя.** Не зусім. Але за тысячу злотых я магу вас выслухаць, ваша каралеўская вялікасць. Што вам трэба?

**Ягайла.** Я хачу, каб ты мяне забіў.

**Чалавек без імя** *(утарапела)*. Кароль жартуе?

**Ягайла.** Так, пакуль жартую. Але паслухай, за якую плату.

**Чалавек без імя.** Ніякая плата няварта вашага забойства.

**Ягайла.** Ну а іншага каго ты мог бы тым часам забіць за... караля?

**Чалавек без імя** *(з палёгкай уздыхнуўшы)*. Замест караля?

**Ягайла.** За караля.

**Чалавек без імя.** Служба ў караля павінна складаць гонар яго падданаму.

**Ягайла.** Праўду кажаш. Але плату мы тым не менш назначым, га?

**Чалавек без імя.** Воля ваша.

**Ягайла.** Ну, дапусцім, дзесяць тысяч хопіць?

**Чалавек без імя.** Ужо адна служба ў караля павінна..

**Ягайла.** Ну, гэта я чуў. Але плата будзе такая. Ты далёка ад мяне не адлучайся. Будзь заўсёды недзе блізка. Спатрэбішся, можа, нават хутка. А за тое, што не згаджаешся забіваць караля...

**Чалавек без імя.** Хіба ж гэта магчыма, ваша каралеўская вялікасць?

**Ягайла.** Дык за тое, што не згадзіўся забіваць свайго караля, дзякуй. Караля забіць ахвотнікаў заўсёды хапае. Яны і цяпер ёсць. Я іх нават ведаю. Але табе дзякуй, чалавеча. Ідзі.

*Чалавек без імя выходзіць. Заходзіць Ахоўнік.*

**Ягайла** *(да яго)*. Ты за гэтым чалавекам яшчэ папільнуй. Няхай каля нас недзе паблукае. Не чуў, як мы з ім пагаварылі?

**Ахоўнік.** Не.

**Ягайла.** Ну, то й добра. Ганца да каралевы паслаў?

**Ахоўнік.** Так.

**Ягайла.** Пашлі яшчэ аднаго. Няхай перадасць каралеве, што мы вяртаемся, а чэрава ў караля пажыло.

**Ахоўнік.** Вярнуўся кракаўскі ваявода.

**Ягайла.** Ах так, я і забыў, што прасіў біскупа пасланць па яго наўздагон.

**Ахоўнік.** Ен тут.

**Ягайла.** Скажы, што можна заходзіць.

## КАРЦІНА III

**Кароль.** Ягайла і кракаўскі ваявода.

**Ягайла.** Даўно мы адзін на адзін не размаўлялі.

**Кракаўскі ваявода.** Затое я заўсёды насіў вас у сэрцы.

**Ягайла.** Дзякуй, пане, дзякуй і на тым. Але скажы мне, што ў Кракаве, нашай сталіцы?

**Кракаўскі ваявода.** Каралеўскія падданыя, ваша вялікасць, моляцца за вас.

**Ягайла.** Пра гэта мне ўжо гаварыў біскуп Алясніцкі. Кракаў моліцца, Вільня рыхтуецца да каранацыі, Кіеў у карты гуляе, а Варшава нібыта весяліцца. Ото ж мне гэта Варшава. Хоча тон задаваць?

**Каралеўскі ваявода.** Тон у нашым каралеўстве, ваша вялікасць, задае звычайна той, хто шчыра моліцца і моцна меч у руках трымае. А ў Варшаве гэты меч, здаецца, ці не рыбіне ў рукі аддадзены?

**Ягайла** *(смяецца)*. Ты як скажаш, мой пане, дык хоць стой, хоць падай. Добра, што сяджу вось. Але ж біскуп казаў, што Вітаўтавы рыцары ўсё часцей і часцей нападаюць на польскія маёнткі. Зноў крывавыя сутычкі?

**Кракаўскі ваявода.** Здаецца, што гэта ад самаго вялікага князя ідзе. Хоча каранавацца, кажуць, ад Сігізмунда вярнуліся паслы ў Вільню.

**Ягайла.** Ну і што?

**Кракаўскі ваявода.** Няхай Езас Хрыстас ратуе ад гэтага нашу дзяржаву! Яна ўжо мае караля!

**Ягайла.** Ну і Вільня захацела, як бачыш, мець свайго. Але я ўжо казаў біскупу Алясніцкаму – ці не замнога ў адной дзяржаве каб два каралі?

**Кракаўскі ваявода.** Не трэба, ваша вялікасць, спрыяць літвінам. Яны заўсёды былі дзікія і нахабныя.

**Ягайла.** Але яны магутныя. Да таго ж, пры вуніях заўсёды так – адзін народ думае, што кароль не яму, а другому спагадае. Ды і сам я літвін. Хіба забыў, пане?

**Кракаўскі ваявода.** Гэта іншая справа. Вы, ваша вялікасць, кароль палякаў!

**Ягайла.** І жмудзінаў, і рускіх, словам, усіх літвінаў таксама.

**Кракаўскі ваявода.** Але ж літвіны гэтак, бадай, не думаюць. Нездарма ж падбухторваюць Вітаўта каранавацца.

**Ягайла.** Сапраўды, падбухторваюць. Хоць Вітаўт і поўны самалюбства, але не да такой ступені! Якраз па гэтай прычыне я і захацеў бачыць цябе, ваявода. У Луцку з гэтай нагоды збіраюцца еўрапейскія знакамітасці. Кароль Сігізмунд таксама паабяцаў прыехаць. Дык вось, пане, паедзеш туды з малым пасольствам. Першы.

**Кракаўскі ваявода.** Паперад караля?

**Ягайла.** Кароль яшчэ не атрымаў запросіну.

**Кракаўскі ваявода.** Якая ж місія будзе ў пасольства?

**Ягайла.** Быць госцем у вялікага князя Вітаўта, пакуль не прыедзе ў Луцк кароль з дваром. Вялікі князь гаспадар слынны, ды і сам ты, пане, не дурань і выпіць, і папаляваць.

**Кракаўскі ваявода.** Чаго не зробіш за чужы кошт, ваша каралеўская вялікасць!

*Абодва – і кароль, і ваявода – смяюцца.*

**Ягайла.** А скажы-тка мне, пане, ты са мной ніколі не хадзіў вайсковым паходам у Масковію?

**Кракаўскі ваявода.** Масковія – гэта, як кажа наш біскуп, літоўская сфера ўплыву.

**Ягайла.** Я ж кажу – са мной ці хадзіў? Пакуль Вітаўт атрымаў магчымасць хадзіць туды, то я ўжо, як кажуць, паўсюль пабываў. Словам, ты са мной у Масковію не хадзіў.

**Кракаўскі ваявода.** Не, але на тэўтонаў, ваша вялікасць, хадзіў. Вось гэта ваша, польская справа, – тэўтоны! Абараняць ад іх заходнія межы кароны... Там наша слава! А маскавіты?.. Цяжкі народ.

**Ягайла.** А я вось ніяк не ўспомню, чаму апошні раз хадзіў у Масковію. Сілюся ўспомніць, а не выходзіць. У Вільні, здаецца, яшчэ жыве мой стары рыцар па тых часах, Юльян, дык ты, ваявода, перакажы яму, каб прыехаў. Хачу пагаварыць. А то ўсё мроіцца апошнія дні лік нейкага сівога ў зрэбным.

**Кракаўскі ваявода.** Можаце спадзявацца, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** І яшчэ. Сярод маіх рыцараў і прыдворных бадзяецца без справы адзін хлопак. Вазьмі яго з сабой. Няхай таксама прыгледзіцца там, у Луцку. Але да сябе моцна не набліжай. Трымай на адлегласці. Ну, то з богам і праўда, ваявода.

*Ваявода схіляе галаву, збіраецца выйсці. Але Ягайла затрымлівае.*

Біскуп Алясніцкі казаў тут, што знатныя польскія кабеты заступіліся ў касцёле за каралеву?

**Кракаўскі ваявода.** Так, мой кароль. Самым шчырым чынам.

**Ягайла.** Я таксама дараваў каралеве. Але тых жарабкоў адшукаць і ў мяшок.

**Кракаўскі ваявода.** Без суда?

**Ягайла.** Ты хочаш, каб гэта непрыгожая гісторыя пры маім двары цягнулася дзесяцігоддзі? Нават, калі я памру? Не, ваявода, мне гэта непатрэбна, асабліва маім дзецям, да якіх я не мяняю сваіх адносінаў. Гэта будучыя польскія каралі! Гэта – не тое, што я – прымак. Яны – паўнапраўныя. Бацькі ж іх – палякі?

**Кракаўскі ваявода.** Няйначай, гэта козні Вітаўта.

**Ягайла.** Вы, палякі, усе свае няўдачы спрабуеце зваліць на вялікага князя. А я яго люблю. Гэта мой брат. Ідзі, ваявода, ідзі.

*Ваявода выходзіць.*

## К А Р Ц І Н А IV

*Ягайла пляскае ў далоні. Заходзіць Ахоўнік.*

**Ягайла.** Дай-тка мне шпагу.

*Ахоўнік прыносіць шпагу.*

Бачыш, таракан на падлозе. *(Бярэ шпагу, перагараджае ёю дарогу таракану).* Увішная істота. *(Пры дапамозе шпагі кароль гуляе на падлозе з тараканам).* Бачыш, якія ён манеўры робіць? Але, халера, імкне кудысьці. Няўхільна імкне. Дарэчы, адкуль тут, у каралеўскім паляўнічым доме, тараканы? Чым яны жывяцца?

**Ахоўнік.** Не ведаю, ваша каралеўская вялікасць. Але я скажу, каб іх паатручвалі.

**Ягайла** *(смяецца)*. Не, іх не патруціш. На іх трэба вялікі мароз. А што, на дварэ вялікі мароз?

**Ахоўнік.** Патроху бярэцца.

**Ягайла** *(не спыняючы гульню з тараканам)*. Няхай нагрэюць мне ложак. Хачу легчы.

**Ахоўнік.** А як жа?

**Ягайла.** Што?

**Ахоўнік.** Ваша вялікасць збіралася ехаць у Кракаў.

**Ягайла.** Думаеш, мне ў Вавелі лепей? Гэта каралеве там добра, а мне... Ты затапчы гэтага тарцкана, вельмі ж ён настырны, як польскі шляхціц. Бачыш, нават шпагі не баіцца.

*Ахоўнік тупае па падлозе нагой.*

Не баішся шляхціца давіць? *(Смяецца).*

**Ахоўнік.** Ваша каралеўская вялікасць жадае, каб коні распрагалі? Будзем тут начаваць?

**Ягайла** *(думае)*. Няхай пастаяць запрэжаныя. А рыцары моцна перапіліся? Яны ж, нябось, тым не абмежаваліся, што за маім сталом пасля палявання пагасцявалі?

**Ахоўнік.** Вашы рыцары заўсёды ў стане скочыць у сядло.

**Ягайла.** Ну то і добра. Я яшчэ пасяджу тут. Шкада, што ты затаптаў таракана. Цікавая істота. Настырная. Цябе кусалі тараканы?

**Ахоўнік.** Не памятаю, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** А мяне кусалі. І моцна. Помню, у паходзе ў Масковію... Царэчы, ты не хадзіў са мной у той паход?

**Ахоўнік.** Не.

**Ягайла.** Шкада. А я ўсё ніяк не магу ўспомніць. Дзіўна, але ніхто са мной не хадзіў у той паход. Вось і ваявода кракаўскі казаў, што не быў са мной у Масковіі. А я ніяк не магу ўспомніць падрабязнасці.

**Ахоўнік.** Скажу, каб прывезлі вам хроніку таго часу.

**Ягайла.** У Кракаве такой хронікі няма. Можа, у Вільні. Добра, ідзі, а я пасяджу. *(Зноў ажывае, хапаецца за шпагу).* Бачыш, зноў паўзе па падлозе таракан, як шляхціц.

*Ахоўнік паціскае плячыма, выходзіць.*

Ніхто нічога не ведае. Усе маладзей нават за мае паходы. Самотна. Адзінока. Хто памёр ужо, а каго... Цікава, Скіргайла сам памёр у Кіеве ці яго атруцілі? Не, старому чалавеку жыць пад канец цяжка, бо застаецца адзін. А з маладымі... Маладыя не разумеюць нас, старых. Таму вось і даводзіцца займацца нанач з тараканамі.

*Зноў пляскае ў далоні. Заходзіць Ахоўнік.*

Скажы, каб знайшлі дзвюх маладзенькіх шляхцянак. Няхай паляжаць са мной па баках у ложку.

## К А Р Ц І Н А V

У пакой забягаюць дзве маладыя шляхцянкі. Пачынаюць перад каралём паказваць сваё ўмельства – скакаць, спяваць, зачаравана вачамі круціць. Ягайла спярша ўсміхаецца, пасля насупліваецца.

**Ягайла.** І што ж вы, акрамя гэтага, можаце? Чаму навучаны?

**Шляхцянкі** *(амаль разам)*. Мы ўсё ўмеем.

**Ягайла.** Вам сказалі, дзеля чаго мне патрэбны?

**Шляхцянкі.** Так, ваша мосць.

**Ягайла.** Ну то і падступайцеся да справы. А скакаць з вамі я ўжо стары і нямоглы. Гэта ў паланезе прайсціся ў танцавальнай залі – куды ні йшло. Ды з адмысловай танцоркай.

**Шляхцянкі.** У нас, ваша каралеўская вялікасць, свая акраса ў прафесіі.

**Ягайла.** Вы ў пасцелі гарачыя?

**Шляхцянкі** *(адна за адной)*. Гэта хутчэй залежыць ад партнёра.

*Ягайла пляскае ў далоні. Заходзіць Ахоўнік.*

**Ягайла.** Каго ж вы падсунулі мне? Гэта ж самыя звычайныя курвы!

**Шляхцянкі.** Фу! Фу! А яшчэ кароль!

**Ахоўнік.** Гэта яны маладыя, і не зразумелі, чаму іх паклікалі.

**Ягайла.** Маладосцю сваёй падзяліцца са старым чалавекам.

*Адна са шляхцянак. У гэтага старога чалавека штогод па дзіцяці паяўляецца.*

**Ахоўнік.** Ну, ты, прыкусі язык. *(Да Ягайлы)*. Вы не турбуйцеся, ваша каралеўская вялікасць, гэтыя дзяўчаты на ўсё здатныя. *(Да шляхцянак)*. А ну – у каралеўскую пасцель. Ды голыя, голыя! І каб не трывожылі караля ўначы!

**Тая ж шляхцянка** *(хіхікае)*. А ўвечары?

**Ахоўнік.** Вы ў мяне дагаворыцеся!

**Шляхцянкі.** А вячэра? Вячэраць дадуць?

**Ахоўнік.** Прыйшлі на добрую справу, то пацерпіце. А заўтра вам не толькі вячэра будзе, а можа, і дубчыкаў пакаштуеце.

*У пакой заходзіць каралеўскі слуга, пачынае распранаць гаспадара.*

## К А Р Ц І Н А  VI

*У прыбудове да паляўнічага дома, ужо ў крыле, сядзяць за сталом кракаўскі ваявода і кракаўскі Біскуп. Перад імі – пітво ў вялікіх карцах, мясная закусь.*

**Кракаўскі ваявода.** Я каралю толькі што адкрыта сказаў, што скандал вакол яго і яго жонкі з'яўляецца вынікам прошукаў Вітаўта. Вялікі князь адчуў, што кароль дажывае апошнія гады. І Рэчы Паспалітай спатрэбіцца новы гаспадар. На Соньку надзеі ніякай, дарма што Вітаўт сапраўдным сватам быў. Ён Ягайлу і ў Друцк завабіў, ён і ракіроўку зрабіў там з сёстрамі. Дарэчы, ніхто іншы, як вялікі князь, і камерыстак гэтых падсунуў. Словам, акружыў літоўцамі каралеўскую сям'ю. Адны жарабкі гэтыя, Сончыны палюбоўнікі, аказаліся палякі. Вось ужо не знайшлося нікога звалашыць іх.

**Біскуп.** Кароль абяцае, што дзяцей не зачэпіць, ды і каралеву будзе лічыць па-ранейшаму за жонку.

**Кракаўскі ваявода.** Хітры літвін.

**Біскуп.** І разумны. Здавалася б ужо ўсё парушана і выйсця з ганебнага становішча няма, а ён, бачыце, змірыў гардыню. І самае правільнае рашэнне прыняў.

**Кракаўскі ваявода.** Я ўжо быў цураўся нейкі час яго. А цяпер бачу, хоць ён палякам за гэты час, пакуль каралём быў, і не стаў, але ж і літоўскі бок цалкам не бярэ. Гэта не так важна, што ён у любові Вітаўту клянецца. Як-ніяк – брат, хоць і не адзінаўтробны.

**Біскуп.** Але ты маеш рацыю – Вітаўт замешаны ў справе здрады каралевы свайму мужу. Спалохаўся за трон, каб мы пасля смерці Ягайлы не паклікалі на яго каго-небудзь з Еўропы. Таму і стварыў сітуацыю – чым горай, тым лепш. Ну а бруд?.. Ды пры якім каралеўскім двары яго няма?

**Кракаўскі ваявода.** Мне ехаць у Луцк. Там наладжваюцца агледзіны Вітаўта, ці прыдатны ён для караля.

**Біскуп.** А кароль? Калі кароль будзе збірацца?

**Кракаўскі ваявода.** Як прыйдзе з Вільні запросіна і на колькі асоб.

**Біскуп.** Літоўцы на гэтых агледзінах прап'юць і пражруць палавіну свайго княства.

**Кракаўскі ваявода.** На пачостківа яны не скупяцца, а тады польскія маёнткі грабяць. Усё падчыстую вымятаюць.

**Біскуп.** Так, неспакойныя суседзі. Але ад Масковіі нас засланяюць. Так што, аўчынка вырабкі вартая.

**Кракаўскі ваявода.** Але мы не пагаварылі яшчэ пра каранацыю Вітаўта.

**Біскуп.** Хіба ж сапраўдныя палякі яе дапусцяць?

**Кракаўскі ваявода.** Але пра гэта цяпер ужо варта думаць.

**Біскуп.** Ты ваявода, пане Станіслаў, табе і належыць заняцца каронай.

**Кракаўскі ваявода.** Каранацыяй ці каронай?

**Біскуп.** І тым, і гэтым, ваявода. Але не таіся ад мяне. У мяне таксама талковыя людзі ёсць.

*Пляскаюць адзін аб адзін карцы з пітвом.*

## КАРЦІНА VII

*Ужо раніца. У пакоі – Ягайла ў ложку, тыя ж дзве шляхцянкі. Тут жа і ахоўнік у чорным.*

**Ахоўнік.** Як мае кадры, кароль?

**Ягайла.** Не пакусалі, і добра.

**Ахоўнік.** Але ж добра грэлі.

**Ягайла.** Грэлі, грэлі.

**Ахоўнік.** Значыць, заслужылі?

**Ягайла.** Гледзячы што.

**Ахоўнік.** Ну, па чырвонцы за ноч, смачны сняданак.

**Ягайла.** Карміць іх моцна не трэба. А то адна ўсю ноч паветра псавала.

**Ахоўнік.** Гэта мы ўдакладнім, ваша каралеўская вялікасць. Пра гэта мы не дамаўляліся ўчора.

**Ягайла.** Ну, ты не вельмі.

*Раптам адчыняюцца дзверы у пакой. Імкліва заходзіць каралева Соф'я Гальшанская. Усе нібыта разгублены. Нават кароль нырнуў пад коўдру.*

**Соф'я.** Ваша вялікасць, вы і тут не здраджваеце сваім звычкам? Ужо даўно раніца, а вы яшчэ ў пасцелі. Можа, захварэлі?

**Ягайла.** Крый божа, крый божа, каралева. Як ты сюды трапіла?

**Соф'я.** Сумна ў Вавелі, вось і прыехала. Хіба не рады?

**Ягайла.** Гасцям я заўсёды рады. Але такая нечаканасць. Што цябе трывожыць?

*Каралева пляснула ў далоні, павысіла голас: «Кыш!» і паказала шляхцянкам на дзверы. Ахоўнік ледзь не сілаю вывеў іх.*

**Соф'я.** Я прыехала сказаць, што ўсе твае патрабаванні я выканала. Цяпер хачу ведаць – што будзе са мной і маімі дзецьмі?

**Ягайла.** А я думаў, што ты будзеш за палюбоўнікаў прасіць?

**Соф'я.** Я пра дзяцей і пра сябе!

**Ягайла.** Я не адракаюся ад цябе, значыць, і дзеці нашы.

**Соф'я.** Гэта палітыка?

**Ягайла.** Тут многія акалічнасці сышліся. А галоўнае – я, нарэшце, зразумеў, што ў тваім блудзе зацікаўлены былі многія людзі – і палякі, і літоўцы. Але скажы, Сонька, як ты?.. Словам, як ты вытрымлівала сямёра жарабкоў? Я ж таксама яшчэ часам трывожыў цябе?

**Соф'я.** Кароль, пашкадуй мяне!

**Ягайла.** Добра. Не ў службу, а ў дружбу – пакліч слугу.

*Каралева выходзіць, вяртаецца з чорным ахоўнікам.*

Сняданак для каралеўскай пары.

**Ахоўнік.** Слухаю, мой кароль.

**Ягайла.** Падай шпагу! Зноў таракан паўзе.

*Ахоўнік спяшаецца да каралеўскага ложка са шпагай.*

*(Да каралевы).* Ведаеш, тут, у гэтым паляўнічым доме, шмат тараканаў.

## К А Р Ц І Н А  V I I I

*У прыбудове сядзіць за сталом Кракаўскі ваявода. Вакол пахаджвае слуга, няйначай, збірае на стол, бо ўжо раніца. На дварэ крычыць певень. Заходзіць кракаўскі Біскуп.*

**Біскуп.** Будзь слаўны Езас Хрыстас наш!

**Кракаўскі ваявода.** Ва векі вякоў!

**Біскуп.** Амін. *(Хукае на рукі, сядае за стол супроць ваяводы).*

**Кракаўскі ваявода.** Чуў, ваша прэасвяшчэнства, каралева тут?

**Біскуп.** Не ўсядзела ў Вавелі!

**Кракаўскі ваявода.** Для яе цяпер усё вырашаецца.

**Біскуп.** Так, але ж кароль палагаднеў. Нябось, паплакаў на грудзях у Соньки?

**Кракаўскі ваявода.** Не без таго, біскуп, не без таго. Жанчына здольная выклікаць не толькі слёзы, але і сперму.

**Біскуп.** Калі яна яшчэ ёсць у старых яйцах.

**Кракаўскі ваявода.** Я ўжо хацеў ад'язджаць у Кракаў. Але варта пачакаць. Можа, спатрэблюся каралеўскім асобам.

**Біскуп.** Пра гэта няхай твая галава баліць. А мне ўначы прыйшла ў галаву такая думка.

**Кракаўскі ваявода.** Ну-ну, выкладвай.

**Біскуп.** У цяперашніх умовах нам не хапаць будзе Свідрыгайлы.

**Кракаўскі ваявода.** Гэты князь – самы зацяты вораг Польшчы. Гэта табе не Вітаўт. Першае, што ён зробіць на волі, зноў пачне інтрыгі супроць дзяржаўнай вуніі.

**Біскуп.** А мы так зробім, што выпусціць яго сам кароль. Тады няхай і на ланцугу сваім трымае брата.

**Кракаўскі ваявода.** Як паставіцца да вызвалення Свідрыгайлы Вітаўт? Ён жа прагнаў яго і з Віцебска, і з Чарнігава-Северскай зямлі.

**Біскуп.** На гэта і трэба разлічваць. На варожасць паміж вялікім князем і Свідрыгайлам. Ва ўсякім выпадку, нам на гэта давядзецца з боку назіраць.

**Кракаўскі ваявода.** Хто будзе з каралём гаварыць?

**Біскуп.** Трэба падумаць. Але закінуць гэтую ідэю трэба будзе ў Луцку. Добра было б, каб імператар Сігізмунд неяк прасякнуўся ёю. Ды і каралеву нашу нvarta трымаць у няведанні. Цяпер яна будзе памяркоўная – мы ж, лічы, заплюшчылі вочы на яе распусту.

**Кракаўскі ваявода.** Таму што яна нам патрэбна, а вось ці патрэбны ёй Свідрыгайла, які сядзіць цяпер у каралеўскіх лёхах?

**Біскуп.** На ўсё воля боская. Памолімся, ваявода, за харч, які пакуль дае нам гасподзь.

*Абодва доўга шэпчуць малітву. Нарэшце слуга ўсё паставіў на стол, выйшаў.*

**Кракаўскі ваявода.** Пачнем, святы айцец. *(Праз нейкі час, пасля таго, як выпіў віна).* Дзіўлюся, як гэта наш кароль не ўжывае гэтага зелля? Здаецца, смачней і карысней нічога не бывае?

**Біскуп.** Кроў зямлі. Але Вітаўт у Луцку не паскупіцца на віно.

**Кракаўскі ваявода.** Так, бадай што будзе мора разліўное.

**Біскуп.** Дык хто ж будзе гаварыць там з імператарам пра Свідрыгайлу?

**Кракаўскі ваявода.** Справа тонкая і небяспечная. Але імператар любіць выпіць. Давядзецца мне ў застоллі шапнуць яму.

**Біскуп.** І пра карону для Вітаўта. Ды і папскіх паслоў нельга пры гэтым абмінуць.

**Кракаўскі ваявода.** Што ж, будзем лічыць, што ўсё паміж нас змоўлена. Як думаеш, кароль сам нас пазаве сёння, ці мы да яго пойдзем?

**Біскуп.** Але ж там жанчына?

**Кракаўскі ваявода.** Каралева – не жанчына. У яе абавязак перад каралеўствам і падданымі.

**Біскуп.** Каб жа гэта сапраўды так было!

*Заходзіць рыцар.*

**Рыцар.** Кароль і каралева пажадалі бачыць вас.

**Біскуп.** Абодвух?

**Рыцар.** Так. Але яшчэ таго-сяго.

**Кракаўскі ваявода.** З каралевай многа людзей прыехала?

**Рыцар.** Лічы, цэлы абоз. Ды яшчэ вершнікі.

**Біскуп.** Што ж, трэба спяшацца. Выходзіць, што ад аднаго стала ды да другога.

**Рыцар.** Кароль з каралевай паснедалі.

**Біскуп.** І ўсё-ткі трэба ўставаць з-за гэтага стала, дарма што і палова таго, што пастаўлена, не з’едзена намі.

**Кракаўскі ваявода.** Нічога, на абед у жываце болей месца застанецца.

*Усе выходзяць.*

## К А Р Ц І Н А  I X

*У пакой, што займае кароль, набілася шмат народу – рыцары, царкоўныя служкі, проста шляхта.*

**Ягайла** *(убачыўшы кракаўскага ваяводу)*. Ты, пане Станіслаў, паслаў у княства ганцоў, каб адшукалі там старога Юльяна?

**Кракаўскі ваявода.** Так, мой кароль.

**Ягайла.** Тады вязіце яго ў Луцк. Мы з каралевай атрымалі сёння запросіну ад Вітаўта быць там. Скажу па шчырасці – не па душы мне падобная зборня. Але брату адмовіць не магу. Ды і імператар свяшчэннай імперыі збіраецца туды. Дык што пасля гэтага нам?

**Галасы.** Трэба ехаць, кароль, трэба ехаць! Не дадзім Вітаўту каранавацца! Мы не дазволім літвінам раскідаць дзяржаўную вунію! Смерць Вітаўту!

**Ягайла.** Вітаўт – мой брат! Таму не крычыце абы што! Хто гэта Вітаўтавай смерці захацеў?

*Усе прыціхлі.*

То-та ж... Але ж у адной дзяржаве не павінна двух каралёў быць. Спадзяюся, вам гэта зразумела?

*Грамада зноў зашумела. Каралева глядзела на ўсё, здаецца, жахалася.*

Тым часам, давайце, паны рыцары і ўсе астатнія, бліжэй да справы. Тым больш, што каранаванне Вітаўта будзе залежаць найбольш ад імператара Сігізмунда. Ды і як у Ватыкане на гэта зноў глядзяць, мы таксама амаль нічога не ведаем. Словам, з намі бог. А цяпер пра тое, дзеля чаго мы з каралевай клікалі вас.

**Адзін рыцар другому** *(ціха)*. Гэта літоўская сучка зноў убіраецца ў сілу.

**Другі рыцар.** Выходзіць, што так. Кароль увесь час падкрэслівае сваю прыхільнасць да яе. Ад нянавісці да любові адзін крок.

**Першы рыцар.** Гавораць не так: ад любові да нянавісці адзін крок.

**Ягайла** *(пляскаў у далоні)*. Спакойна, панове, спакойна! У Луцк першае паедзе невялікае наша пасольства на чале з ваяводам кракаўскім. Мы ўжо гэта абгаварылі паміж сабой. Пасля рушым і мы. Кожны, хто жадае паехаць, павінен знайсці сабе месца і занятак. Я не хацеў бы, каб палякі ў Луцку адно пілі і жэрлі.

За намі ёсць дзяржава, а ў дзяржаве звычайна шмат дзяржаўных спраў. Хто мае карысную думку?

**Адзін з рыцараў.** Яснавяльможны кароль, я тут параскінуў розумам дык нічога лепей не прыдумаў для Польшчы...

**Ягайла.** Ну-ну, кажы, не бойся. Шчырасць на шчырасць.

**Той жа рыцар.** Трэба перахапіць карону па дарозе ў Рэч Паспалітую ды шаблямі, шаблямі. А Вітаўт няхай новую просіць. Пачнуцца валэнды, а там... Усе мы не вечныя. Можа, нікому другому на Літве і каранавацца не прыйдзе ў голаў.

*Хтосьці зноў закрычаў у натоўпе: «Смерць Вітаўту! Смерць!»*

**Ягайла.** Мусіць, рыцар не працвярэзіўся з учарашняга? Выведзіце яго адсюль і дайце пахмяліцца.

*У пакоі прысутныя заварушыліся, ляснулі дзверы – няйначай п'янага рыцара сапраўды вывелі.*

# ДЗЕЯ ДРУГАЯ

## КАРЦІНА Х

*Біскуп кракаўскі сёння служыць службу ў Луцкім касцёле, запоўненым прыезджымі, бадай, з усяго еўрапейскага свету. Тут і ваявода кракаўскі.*

**Нехта** *(пытаецца ў яго).* Яснавяльможны пан, дзе тут будзе імператар Сігізмунд?

**Кракаўскі ваявода.** Аён яшчэ, здаецца, не вылазіў з-за стала. Вітаўт моцна частуе. Сёння ўсе падаюцца на паляванне – і пешыя, і конныя.

**Нехта** *(зноў пытаецца).* Хіба ж імператар не каталік?

**Кракаўскі ваявода.** Каталік, а што з таго?

**Нехта.** Ці ж можна прапусціць імшу, калі служыць біскуп?

**Кракаўскі ваявода.** Няйначай, каталік-імператар забавіўся з язычнікамі. Тут жа цяпер літоўцаў багата. Але давайце памаўчым. На нас пазіраюць. Скора ў каршэнь надаюць.

*Нехта прашыўся ў натоўп, згубіўся там за высакароднымі спінамі. Да ваяводы набліжаецца рыцар.*

**Рыцар.** Каралеўскі двор прыехаў, пан ваявода.

**Кракаўскі ваявода** *(усё роўна як недаверліва паглядзеў на рыцара).* Прыехаў? Нарэшце і мы не будзем адчуваць сябе сярод варвараў сіратамі.

*Рыцар пастаяў яшчэ трохі, адышоўся. Ваявода кіўнуў галавой камусьці ў натоўпе, паклікаў да сябе.*

**Кракаўскі ваявода** *(да падступіўшага)*. Няважна выйшла. Каралеўскі двор прыехаў, а тут і сустракаць няма каму. Усе ў касцёле.

**Падступіўшы.** Дык біскуп жа служыць.

**Кракаўскі ваявода.** У тым-та і справа. Накладка выйшла. Кароль разгневаецца. Ды і каралева маўчаць не стане, моў, прыўрочылі службу!.. Ты вось што, Стах, паспяшайся зараз туды, паглядзі там на ўсе вочы ды паслухай на ўсе вушы, а я застануся ў касцёле да канца службы. Трэба перакінуцца словам з біскупам.

*І гэты чалавек, якога ваявода назваў Стахам, знікае ў натоўпе. Кракаўскі ваявода круціць галавой. Але вось прагучэў апошні «Амін». Вернікі ў касцёле зварухнуліся, пачалі патрохі выходзіць. Ваявода падаўся бліжэй да алтара.*

Святы айцец, кароль у Луцку!

**Біскуп.** Як жа ён паспеў?

**Кракаўскі ваявода.** Відаць, косці старэчыя трохі растрос.

**Біскуп.** Ну што ж, я зараз.

*Адыходзіць.*

## К А Р Ц І Н А  XI

Кароль Ягайла і каралева Соф'я ў адведзеных для іх апартаментах.

**Соф'я.** Кароль адпачываць будзе?

**Ягайла.** Ды ўжо не праміну паваляцца ў пасцелі. Як думаеш, тут тараканаў няма?

**Соф'я.** Адкуль ім узяцца пры гэткай чысціні?

**Ягайла.** Шкада. Чым жа стану займацца перад сном?

**Соф'я.** Тут столькі патрэбных асоб з'ехалася, што дай бог табе часу.

**Ягайла.** У Рэчы Паспалітай такіх праблем сёння няма, каб вялікую палітыку пачынаць кеадкладна.

**Соф'я.** А Вітаўт? А карона?

**Ягайла.** Ну, пра гэта няхай баліць галава ў палякаў. А Вітаўт мне брат. І літоўцаў я люблю. Дарэчы, сваякоў тваіх таксама люблю, дарма што неспакойныя і моцна лезуць у палітыку паміж каралеўствам і княствам. Так што, менш інтрыг, больш забаў. Ты таксама не запірайся ў сваіх келлях.

**Соф'я.** Але яшчэ адна справа да цябе ёсць.

**Ягайла.** У цябе?

**Соф'я.** У мяне таксама.

**Ягайла.** Тады кажы.

**Соф'я.** Трэба нарэшце брата твайго са зняволення вызваліць. Ну, колькі яму сядзець. Сваю правіннасць ён даўно ўжо скупіў.

**Ягайла.** Гэта нешта новае... І нечаканае. Што за гэтым хаваецца?

**Соф'я.** Нішто, проста кароль павінен яшчэ раз паказаць перад усімі сваю велікадушнасць.

**Ягайла.** Ну, дапусцім, што гэта на карысць каралю. Але хто за гэтым стаіць?

**Соф'я.** Мяне стрыечны брат мой прасіў, каб я першая пагаварыла пра твайго брата. Вы ж абодва Альгердавічы.

**Ягайла.** О, калі тое было!

**Соф'я.** Як ведаеш, але просьбу свайго брата я не магла не выканаць.

**Ягайла.** Пашлі ганца па твайго брата.

**Соф'я.** Ен ужо, здаецца, недзе тут.

**Ягайла.** Спадзяюся, што ў цябе падобных просьбаў больш няма?

**Соф'я.** Не, мой кароль. Як перад богам.

**Ягайла.** Вось табе мая парада, дарагая. Не бярыся за даручэнні, якія не табе выконваць. Жыві тут, як жонка манарха. А справы пакінь мне. Ну, ідзі да сябе. Мне трэба памаліцца святой Брыгіце.

**Соф'я.** Іду, іду, мой збавіцель.

*Выходзіць.*

## К А Р Ц І Н А Х І І

*Да караля Ягайлы ў пакой урываецца вясёлая кампанія. Гэта кампанія імператара Сігізмунда. З ёю і сам* Сігізмунд.

**Сігізмунд.** Ты не палохайся, Уладыслаў, мы не надоўга. Але загадай паднесці па чарачцы маёй хэўры. Вітаўт прасіў, каб я ўгаварыў цябе на абед. А дзе ж каралева?

**Ягайла.** У сваёй палавіне.

**Сігізмунд.** Трэба спадзявацца, што цяпер ты з яе вачэй спускаць не станеш? *(Смяецца).* Ну, то збірайся на абед да вялікага князя. Частуе выдатна. За гэтыя дні я ўжо свой жывот разбіў на дзічыне. Смачна літоўцы гатовяць.

**Ягайла.** У Вітаўта повар з рускіх.

**Сігізмунд.** Тут у вас не даўмецца – хто рускі, хто паляк, хто літвін, але ж ёсць яшчэ і жмудзіны.

**Ягайла.** І татары, і яўрэі.

**Сігізмунд.** Так, так – і татары, і яўрэі. Але мы пра ўсё яшчэ пагаворым. *(Да сваіх спадарожнікаў).* Ну, хадземце, сябры!

## КАРЦІНА XIII

*Вялікі князь Вітаўт – як кажуць, сама бесклапотнасць. Смуглы твар пасвятлеў, з усмешкай. Яго акружаюць літоўскія рыцары. Што ж – ён на сваёй зямлі. Ён гаспадар і прымае гасцей.*

**Князь Іван Друцкі** *(да Вітаўта)*. Я вось пра што, вялікі князь. На сённяшні дзень у нас прызначана каралеўскае паляванне, а яго вялікасць толькі што прыехаў з дваром у Луцк.

**Вітаўт.** Кароль не стане ў адзін дзень перасядваць з сядла ў сядло. Ды і каралева пры ім. Можна ўявіць цяперашнія яе ласкі. У страха вочы вялікія.

**Князь Іван.** Ды і імператар...

**Вітаўт.** Што імператар?

**Іван.** Слабы на ногі стаў. Амаль на сагнутых ходзіць.

**Вітаўт** *(смяецца)*. Дзіўна было б, каб ён пасля столькіх дзён узліянняў моцна трымаўся на нагах.

**Іван.** Але дужы, халера! З запойнага стала ды адразу да дзевак.

**Вітаўт** *(не зганяючы ўсмешкі з твару)*. Чаму зайздросціш, князь? Ты лепей успомні пра нашу маладосць! А цяпер адны дзяржаўныя турботы. Я іншы раз думаю – ну, навошта нам, літоўцам, гэтая карона? Жылі без яе і будзем жыць, сягаючы ад мора да мора!

**Іван.** Сам ведаеш, вялікі князь, я на гэты конт іншай думкі.

**Вітаўт.** Ну, ты наогул супроць вуніі паміж Польшчай і Літвой.

**Іван.** А ты?

**Вітаўт.** Хачу, каб у Рэчы Паспалітай усе былі аднолькавыя – і палякі, і жмудзіны, і рускія. І каталікі, і праваслаўныя. Палякі бессаромна акаталічваюць Літву. Пад рознымі прычынамі. А нашы мядзведзі ўсё яшчэ не могуць як след расшупіць ды лапай адмахнуцца.

**Іван.** Так, небяспека вялікая. Ватыкан зрабіў абавязкам палякам выцесніць праваслаўных да самага Уралу. А там ужо – Азія. Так што...

**Вітаўт.** Добра. Хіцер Зміцер, але і Саўка не дурны. Паляванне на сёння мы адменім. Але ты па-сваяцку пагавары аб гэтым з каралевай. Няхай яна сёе-тое бярэ на сябе перад мужам.

**Іван.** Ей цяпер нялёгка. Ды і прымхлівая яна заўсёды была.

**Вітаўт.** Нічога, захоча па-ранейшаму каралевай быць – будзе кружыць.

**Іван.** Хіба што...

**Вітаўт.** Ну а што Сігізмунд? Якое яго апошняе слова?

**Іван.** Вакол яго ўвесь час палякі тоўпяцца. Нам, літоўцам, цяжка падступіцца. Але мы знайшлі момант паразумецца з імператарам. Ён не змяніў свае думкі.

**Вітаўт.** Як я разумею, мне лепей будзе гаварыць адразу з двума каралямі? Ну, напрыклад, за абедам альбо на тым жа паляванні.

## К А Р Ц І Н А  X I V

*Кароль Ягайла сцішана сядзіць на ложку. Ен толькі што прачнуўся. Заходзіць Соф'я.*

**Соф'я.** Як адпачыў, мой павяліцель?
**Ягайла.** Вітаўт не клікаў на госці?
**Соф'я.** Яшчэ не. Але паляванне ў твой гонар адмяніў.
**Ягайла** *(насцярожана).* Як гэта адмяніў?
**Соф'я.** Позна ўжо, а ты лёг адпачываць.
**Ягайла.** І толькі ў гэтым прычына?
**Соф'я.** Так гаварыў брат Іван. Але ў мяне скарга, кароль.
**Ягайла.** Хто-небудзь пакрыўдзіў?
**Соф'я** *(як у роспачы).* Усе! Усе коса глядзяць! Адпусці мяне пад якой-небудзь прычынай у Кракаў! Не магу пераносіць схаваных насмешак!
**Ягайла.** Я спачуваю табе, дарагая, але прычыну для твайго ад'езду адсюль знайсці немагчыма. Прынамсі, я яе не бачу.
**Соф'я.** Не знаю, не знаю, а я не вытрымаю!
**Ягайла.** Ты дужа не хвалюйся. Я сёе-тое зраблю. Прыму сякія-такія захады, каб цябе не трывожыць дарэмна. *(Кароль пляскае ў далоні. Заходзіць знаёмы ахоўнік).*
**Ахоўнік.** Слухаю, ваша каралеўская вялікасць.
**Ягайла** *(да каралевы).* Ты, Сонечка, займіся сваімі жаноцкімі клопатамі, а мне тут трэба пагаварыць без сведак.

*Соф'я выходзіць.*

*(Да ахоўніка).* Няхай прывядуць да мяне таго чалавека, ну, таго, што без імя і адгукаецца на «Гэй, ты!»

*Ахоўнік выходзіць.*

Цікава, абед сёння будзе? Ці Вітаўт рашыў замарыць гасцей голадам?

*Заходзіць Чалавек без імя. Спыняецца моўчкі на паўдарозе да караля.*

Ты служыш мне аддана?
**Чалавек без імя.** Так, ваша каралеўская вялікасць. Я ведаю, што на службе ў караля небяспечна кідацца з аднаго боку ў другі. Што дазволена магнатам – не дазволена халопам.
**Ягайла.** Каралева скардзіцца, што яе даймаюць на вуліцы насмешкамі – тайнымі і яўнымі. Спадзяюся, здагадваешся праз што?

*Чалавек без імя маўчыць. Кароль працягвае.*

Цяпер трымайся бліжэй да каралевы. Канечне, назаляць вельмі не трэба, ды і цікаўным людзям не вельмі кідайся ў вочы. Лепей часцей пераапранайся. Грошы на гэта табе дадуць.

**Чалавек без імя.** О, іх тут многа патрэбна!

**Ягайла.** Будзеш мець, будзеш мець. Але і язык не бойся сяму-таму прышчаміць. Нават больш таго, самых зацятых плеткароў – ці гэта кабеты, ці кавалеры... Словам, мне не хацелася б вучыць цябе, тым больш даваць інструкцыі. Дык караля забіваць не станеш?

**Чалавек без імя.** Вы жартуеце, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла.** Каралі заўсёды незразумела жартуюць. Гэта – каб кожны помніў. А на каралеву паслужы. Дзе ты спыніўся жыць?

**Чалавек без імя.** У аднаго халопа.

**Ягайла.** Тараканы ў хаце ёсць?

**Чалавек без імя.** Здаецца, не бачыў. Але можна пашукаць.

**Ягайла.** Вось-вось, пашукай і прынясі сюды. А то няма куды дзявацца ад нуды. Ну, ідзі, ідзі на новую службу. Дарэчы, а што цікавага на старой?

**Чалавек без імя.** Біскуп з ваяводам кракаўекім вакол імператара Сігізмунда часта завіхаюцца. Гасцей не прапускаюць.

**Ягайла.** Ну добра, ідзі, ідзі!

*Чалавек без імя выходзіць, а чорны ахоўнік дакладвае каралю.*

**Ахоўнік.** Ваявода кракаўскі, мой кароль.

**Ягайла.** Няхай заходзіць. *(Да ваяводы)*. Гэта добра, што ты адразу да свайго караля. Ну, расказвай.

**Кракаўскі ваявода.** Меў гаворку з імператарам пра каранацыю, з якой усхадзіўся Вітаўт.

**Ягайла.** Ну і што, якія вынікі?

**Кракаўскі ваявода.** Думаю, што цяжка нам будзе знайсці згоду. Імператар пакуль цалкам на баку Вітаўта. Цікава, што ён гэтым хоча дамагчыся?

**Ягайла.** Проста дзівачыць – і ў жыцці, і ў палітыцы.

**Кракаўскі ваявода.** Каб жа гэта было толькі так.

**Ягайла.** Ну, сёе ж тое і ад нас на гэтым свеце залежыць. Што ж тычыцца імператарскай прыхільнасці да Вітаўта, дык і мне ён любы. І не толькі таму, што брат. Дарэчы, які расклад для гасцей сёння ў Вітаўта?

**Кракаўскі ваявода.** У мяне такое ўражанне, што яны з імператарам не выйшлі яшчэ з учарашняга запою.

**Ягайла.** Так, абое рабое. Ты мяне, ваявода, трымай у курсе тутэйшых спраў. А чаму майго старога таварыша па маскоўскім паходзе ўсё яшчэ з Літвы няма?

**Кракаўскі ваявода.** Не ведаю, мой кароль. Але я паслаў у княства па яго адразу.

**Ягайла.** Пацікаўся зноў.

**Кракаўскі ваявода.** Хіба што... Дык я пайду, мой кароль?

**Ягайла.** Ідзі, ваявода, ідзі. Але надоўга не забывай мяне.

*Кракаўскі ваявода выходзіць. Кароль заве ахоўніка.*

У мяне такое адчуванне, што тут, у гэтым Луцку можна памерці з голаду. Клічце каралеву ды нясіце абед. Спадзяюся, прыпасы мы з сабой прывезлі?

**Ахоўнік.** У чым, у чым, а ў гэтым недахопу не будзе, мой кароль.

*Ягайла ад задавальнення смяецца.*

## КАРЦІНА XV

*Ягайла не чакаў, але да яго раптам заходзяць імператар Сігізмунд і вялікі князь Вітаўт.*

**Сігізмунд.** Не спадзяваўся, кароль, на такія госці?

**Ягайла.** Якраз дарэчы. Зараз прыйдзе Соф'я. Будзем абедаць.

**Вітаўт.** Гэта я вінаваты.

**Сігізмунд.** У цябе ж за сямейным сталом віна не падаюць? Цвярэзнік! Гэта ж трэба – кароль і не п'е! А можа, пад коўдрай? Я аднаго такога валадара ведаў.

**Ягайла** *(з усмешкай)*. Не, на мне такога граху няма.

**Сігізмунд.** Таму ад цябе бабы бегаюць да другіх.

**Вітаўт.** Мы, брат, намерваліся ў твой гонар сёння наладзіць паляванне. Шкада, што двор твой позна прыехаў. Таму, бачыш, усё зрушылася.

**Ягайла.** А я, брат, заўсёды бываю вінаваты, калі сярод другіх віну шукаюць. Я ўжо да ўсяго прывык.

**Сігізмунд.** Ну а што ўдвох прыйшлі да цябе, то... Словам, гэта знарок. Тут твае людзі да мяне падступаюць, каб я не дазваляў твайму брату каранавацца. Але што зробіш, калі я яго даўно ўпадабаў. Дастойны муж і вялікі воін. Словам, каб спыніць інтрыгі, скажу: мяняць сваё слова я не стану. Ватыкан таксама гатовы другі раз дазвол даць. Засталося толькі прывезці карону.

**Ягайла** *(доўга маўчыць ад імператарскай шчырасці, нарэшце гаворыць)*. Я таксама, кароль, не меней ад іншых брата свайго люблю, але ж у адной дзяржаве два каралі...

**Сігізмунд.** Ну і што? У маёй свяшчэннай імперыі не злічыць іх – каралёў і карон. Мала хто за ніжні стол хоча сядаць. Але ў імперыі, хвала Езасу Хрыстасу, цішыня і раскоша.

**Ягайла.** Гэта пакуль, мой імператар. Гэта пакуль справа да амбіцый не дайшла.

**Вітаўт.** На амбіцыі патрэбна дужая рука.

**Ягайла** *(з усмешкай)*. Амбіцыі – гэта як тая вада, што пратачылася праз плаціну.

**Вітаўт.** Словам, ты, брат, не ўхваляеш маю задуму з каранацыяй?

**Ягайла.** Ты маю думку чуў.

**Вітаўт.** Ты як здрадзіў з Ядвігай літвінам, так і цяпер працягваеш сваю здраду.

**Ягайла.** Моцна сказана, брат!

**Вітаўт.** Затое без хлусні.

**Сігізмунд.** Ладна, не сварыцеся. Я сваю волю сказаў, і буду пасабляць Вітаўту ў гэтай справе. Вялікі князь літоўскі варты кароны. На гэтым і парашылі. А цяпер... Дзе твой абед, кароль?

## КАРЦІНА XVI

*Пасля абеду Ягайла выходзіць на ганак. Блішчаць апошнія промні сонца. Недзе спявае певень. Іржэ застаялы конь. На ганку калыхнулася з абодвух бакоў варта. Перад ганкам на зрэзаным бярозавым пні сядзіць юродзівы.*

**Ягайла** *(да юродзівага)*. Каго чакаеш, божы чалавек?

**Юродзівы** *(амаль з пагардай)*. Караля!

**Ягайла.** На што табе кароль?

**Юродзівы.** Хачу паглядзець. Ды тое-сёе параіць.

**Ягайла.** Нічога цікавага. Кароль у старасці такі ж юродзівы, што і ты. Ды і што ўзяць з прымака? Ад адных цалкам не адышоў і да другіх на самай справе не прыстаў.

**Юродзівы.** Кажуць, ягоная жонка, гэта значыць, наша каралева скурвілася?

**Ягайла.** Дык ты хочаш даведацца пра гэта ад яго?

**Юродзівы.** Ну, з самых першых рук.

**Ягайла.** А ты верыш, што каралева... Ну, што каралева?..

**Юродзівы.** Чалавек слаб, асабліва кабета, ну а што да дзевак!..

**Ягайла.** Як відаць, жанчын ты не жалуеш?

**Юродзівы.** Твая праўда. Але як думаеш, кароль сёння выйдзе на вуліцу?

**Ягайла.** Адкуль мне знаць? *(Крычыць)*. Гэй, хто там?

*На ганак выходзіць Ахоўнік.*

Дайце небараку злотых, ды няхай ідзе адсюль. Залішне цікаўны. Ажно смярдзіць.

*Вяртаецца ў пакоі.*

## КАРЦІНА XVII

*Чалавек без імя прыносіць Ягайлу тараканаў у скрыначцы.*

**Чалавек без імя.** Куды ж іх цяпер, ваша каралеўская вялікасць?

**Ягайла.** А вось зараз... на падлогу. Ты толькі пачакай трохі. Дзе мая шпага?

*Чалавек без імя звешвае са сцяны шпагу, падае каралю.*

Ну а цяпер выпускай. Так проста на падлогу.

*Чалавек без імя выпускае тараканаў.*

Хочаш паглядзець, як яны стануць шушукацца?

**Чалавек без імя.** Калі будзе на тое ваша воля.

**Ягайла.** Ды і час расказаць, што там шляхта?

**Чалавек без імя.** Здаецца, прыціхла ды наўкол азіраецца.

**Ягайла.** Даўно б так.

**Чалавек без імя.** Я наняў трох зухаватых шляхціцаў з бедных, дык тыя размахваюць шаблямі направа і налева ў гонар каралевы. Ужо адбылося некалькі боек.

**Ягайла.** Але сам цяпер не дужа высоўвайся. Ды і да мяне прыходзь толькі па выкліку. А грошы будуць даваць... Ну, нехта будзе даваць. Бывай.

*Чалавек без імя выходзіць. Ягайла пачынае пасвіць шпагаю тараканаў, выгаворваючы розныя ласкавыя словы. Заходзіць біскуп Алясніцкі.*

**Біскуп.** Будзь слаўны Езас Хрыстас наш!

**Ягайла.** Ва векі вякоў. Ну што, пане Збігнеў. Казалі, што імша сёння добра прайшла ў касцёле. Шкада, я спазніўся. Але прызнацца – для мяне ў касцёле ўсё менш і менш забавы.

**Біскуп.** Ці ж у касцёл дзеля аднае забавы ходзяць?

**Ягайла.** Не чапляйся за словы, пане Збігнеў. Да мяне прыходзілі Вітаўт з імператарам Сігізмундам. Імператар стаіць за каранацыю вялікага князя. Мае пярэчанні поспеху не мелі.

**Біскуп.** А што Вітаўт?

**Ягайла.** Гаварыў адзін імператар.

**Біскуп.** Значыць, намаганні нашы дарэмныя?

**Ягайла.** Выходзіць, што так. А тут яшчэ праблема ўзнікла. Праўда, імператар прамаўчаў пра яе. Але ж я здагадваюся, што ён пры Вітаўце знарок прамаўчаў.

**Біскуп.** А што такое, мой кароль?

**Ягайла.** Збіраецца партыя за вызваленне Свідрыгайлы.

**Біскуп.** У гэтым нейкі сэнс, мой кароль, ёсць.

**Ягайла.** Супрацiўніка Вітаўту выпусціць?..

**Біскуп.** А хоць бы і так.

**Ягайла.** Баюся, што нам неўзабаве зноў давядзецца яго лавіць. Я свайго малодшага брата ведаю.

**Біскуп.** Не, мой кароль, у гэтым штосьці ёсць. Трэба з тым-сім параіцца. А што датычыць каранавання вялікага князя, то яшчэ ж Польшча не згінэла. Гэта

ж не першы раз. Адзін раз не выйшла, можа, дасць бог, і другі раз не атрымаецца. А вось дарогу да трону сыну твайму Уладыславу расчышчаць трэба.

**Ягайла.** Думаеш, Уладык мой сын?

**Біскуп.** На цябе ж падобны!

**Ягайла.** А Казік?

**Біскуп.** Я, мой кароль, у здагадкі не гуляю і табе не раю займацца гэтым. Дзеці заўсёды найбольш падобныя на суседзяў.

**Ягайла.** Дык кажаш, што пра Свідрыгайлу варта падумаць? Баюся, што гэта зноў нейкая інтрыга на ўсю дзяржаву. Га?

*Біскуп паціскае плячамі.*

Ну, а каго ж вы ў рэгенты намячаеце?

**Біскуп.** Калі будзе на тое твая воля, то каралеву Соф'ю і Вітаўта.

**Ягайла.** Значыць, я хутка старэю. Нездарма выйшаў на гэты дзіўны занятак – пасвіць тараканаў. А чым ты, біскуп, цешыш сябе ў вольны час?

**Біскуп.** Перасыпаю чоткі.

**Ягайла.** М-да, кожнаму сваё.

*Біскуп крыжуе рукой караля, выходзіць.*

## К А Р Ц І Н А X V I I I

*Нарэшце кароль Ягайла дачакаўся рыцара Юльяна з Літвы. З ім ён некалі, гадоў пяцьдзесят таму назад, хадзіў паходам у Масковію на дапамогу хану Мамаю, з якім быў у дзяржаўнай дамове. Ягайла сустрэў старога воя на ганку. Абдымаў, ляпаў па спіне, гаварыў нейкія словы, адным ім зразумелыя.*

**Юльян.** Як ты пачуваеш сябе, кароль?

**Ягайла** *(уздыхае)*. А так і пачуваю, стары таварыш. Стаў зусім сівы і нямоглы, дарма што хвост трымаю. Ды і што зробіш – жонка маладая, дзеці малыя, вакол іх таксама гіблых месцаў нямала. Словам, увесь у інтрыгах. Нябось жа чуў, як гавораць: прымачы хлеб – сабачы хлеб.

**Юльян.** Навошта клікаў?

**Ягайла.** А вось пра гэта мы пагаворым з табой. Пра ўсё жыццё, што яшчэ засталося ў нас. Спадзяюся, ты не спяшаешся назад?

**Юльян.** Я спрадвечны воін і асабліва не разжыўся ў жыцці. Можна сказаць, зусім бабыль. Гэта добра, што яшчэ знайшлі мяне твае людзі ў адным гасцінным прытулку.

**Ягайла.** Цяпер твой прытулак тут.

**Юльян.** Дзякуй, кароль, я вельмі ўсцешаны. Дык у чым справа?

**Ягайла.** А ты не спяшайся. Я вось адну справу зараз павінен вырашыць: выпускаць з астрога Свідрыгайлу, ці не?

**Юльян.** А навошта ён цяпер табе ў турме?

**Ягайла.** Апошні час я неяк не думаў пра гэта. Найбольш займаюся тараканамі.

**Юльян.** Разводзіш?

**Ягайла.** Не, забаўляюся. Як кажуць, чым бы дзіця ні цешылася...

**Юльян.** А я лазу шабляй сяку.

**Ягайла.** Сапраўдны воін.

**Юльян.** Хлопцы скардзяцца, што праз гэта кошыкаў няма з чаго плесці.

**Ягайла.** Таксама клопат. Але мы вось што зараз зробім. Пойдзем у госці да каралевы. Цяпер да яе трапіць лягчэй, чым раней. Там і павячэраем. Я скажу, каб табе таксама ложак паставілі ў гэтым пакоі.

*Выходзяць.*

## К А Р Ц І Н А  X I X

Каралева трохі збянтэжана: яна чакала аднаго караля.

**Ягайла.** Гэта мой даўні таварыш, яшчэ па маскоўскім паходзе. Рыцар Юльян.

**Соф'я.** Твае сябры – мае сябры.

**Ягайла.** Ну, у цябе іх больш. І сярод палякаў, і сярод літоўцаў.

**Соф'я.** Не будзем лічыць, мой уладар. Але вячэра гатова. Можна ісці ў сталовую.

*Юльян бярэ каралеву пад руку, ідуць на вячэру. Расселіся за сталом.*

**Ягайла.** Не бянтэжся, Юльян, зараз каралева паклапоціцца пра добрае віно... Сам я даўно ўжо не п'ю.

**Юльян.** А піў, мой кароль.

**Соф'я.** На нашым вяселлі ўвесь тыдзень быў цвярозы.

**Ягайла** *(заўсміхаўся)*. Гэта ж як Соня за мяне выйшла? У Гальшанскіх было ажно тры нявесты: Васіліса, Соня і Марыля. Я ўжо нямоцна помню, як трапілі мы ў Друцк, дзе выхоўваліся сёстры. Зразумелая справа, што сватацца трэба за старэйшую. А мне Соня прыглянулася. Тады Васілісе знаходзяць хутка жаніха. А мы з Соняй гуляем вяселле.

**Юльян.** Няхай дае бог. *(Выпівае чарку віна)*.

**Ягайла.** Спадзяюся, каралеве ад нашых размоў не стане сумна. Тады пачынаем.

**Юльян.** Я ўвесь увага, ваша каралеўская літасць.

**Ягайла.** Апошні час мне не дае спакою той маскоўскі паход, у якім мы былі разам, калі хадзілі на дапамогу хану Мамаю.

**Юльян.** Дык што рупіць?

**Ягайла.** Непакоіць тое, што ўсе тыя падзеі выпалі з галавы. Нічога не помню. А хронік, здаецца, няма. Прынамсі, у каралеўстве. Раскажы мне, калі

помніш. Там адным часам нейкая мая віна і заслуга. І яшчэ – часта бачыцца мне нейкая замглёная постаць. Нешта ад яе тады залежала.

**Юльян.** Вось ты пра што, кароль! Калі дазволіш, я таксама паразважаю, бо многае і праўда забылася.

**Ягайла.** Ну-ну, паразважай.

**Юльян.** Самае важнае ва ўсім гэтым, што на баку маскоўскага Дзімітрыя быў твой брат Андрэй і яшчэ многа славянскіх князёў. Дарэчы, яны і ў Кулікоўскай бітве прымалі самы чынны ўдзел. Да таго ж, палкі, якія ты ўзяў у паход, складаліся з праваслаўных.

**Ягайла.** А што гэта за Кулікоўская бітва?

**Юльян.** Там Дзімітрый Маскоўскі разбіў Мамая. А мы прастаялі паблізу, не пайшлі на падмогу залатаардынскаму хану. Дарэчы, Алег Разанскі, які быў, як і ты, у дагаворы з Мамаем, таксама прастаяў са сваім войскам недзе паблізу ад таго поля. Цяпер Дзімітрый Маскоўскі завецца Данскім. Бітва адбылася недалёка ад Дону. Так што рускія няхай дзякуй скажуць і табе, і князю Алегу, што вы ўстрымаліся.

**Ягайла.** А яны?

**Юльян.** Ну, самі ж пабілі Мамая. Ды і некаторыя нашы ў героях ходзяць. Асабліва брат твой Андрэй.

**Ягайла.** Дзе ён цяпер?

**Юльян.** Загінуў у бітве з татарамі на рацэ Ворскла. Пра інтрыгі не забываў да канца свайго жыцця. Так што, у цябе цяпер адзін брат – Свідрыгайла. І той недзе ў лёхах.

**Ягайла.** Ну а што за стары? Сівы? Як праз туман мне бачыцца. І ніяк не ўспомню, хто гэта быў?

**Юльян.** Так, прыходзіў тады ў Адоева, дзе мы стаялі, адзін манах. Сергій з Раданежа. Угаворваў цябе за праваслаўных.

**Ягайла.** Спадзяюся ж, не ён адбіў ахвоту ў мяне ісці да Мамая?

**Юльян.** Гэта аднаму табе, мой кароль, ведама. Ды яшчэ богу. Заставаліся ж вы з тым манахам адзін на адзін падоўгу. А калі гаварыць больш дакладна – супроць твайго ўдзелу ў бітве на баку хана Мамая былі і брат твой Андрэй, і наша праваслаўнае войска...

**Соф'я.** Было б пра што цяпер гаварыць. Ты ж пра Грунвальдскую бітву не забываеш? Значыць, ёсць што ўспамінаць. Ну а пра тую... Як яе?

**Юльян.** Кулікоўскую.

**Соф'я.** І ўспамінаць няма чаго. Вы ж на яе не дайшлі.

**Ягайла.** А чаму яна мяне так займае, нават трывожыць. І кожны раз пры гэтым чую конніцу. Вось і цяпер тупат капытоў за вокнамі. Вы не чуеце?

**Соф'я.** Галюцынацыі.

**Ягайла.** А вы лепей паслухайце.

**Соф'я** *(амаль пагардліва пацiскае плячамі)*. Ціха.

**Юльян.** Ды не, каралева, кароль ці не праўду кажа.

*І на самай справе – ужо ажно вушы глухнуць ад конскага тупату. Значыць, усё яшчэ кудысьці імкне Ягайлава конніца. Цяпер ужо, здаецца, міма ўсіх бітваў, у несмяротнасць.*

**Ягайла.** Бачу, каралеве нецікава наша размова. Давай, стары таварыш, падзякуем гаспадыні за вячэру ды рушым да сябе. *(Устае з-за стала)*. Я пакажу табе сваіх тараканаў. *(Да Соф'і)*. А Свідрыгайлу, брата майго меншага, няхай выпусцяць на волю.

**К А Н Е Ц**

ІВАН ЧЫГРЫНАЎ. ВЕРНАСЦЬ ПРАЎДЗЕ

ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ
НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА
БЕЛАРУСІ

libmogilev.by/chigrinov